ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.03.2020 № 30

# Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Геаграфія раёна» для IX класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Геаграфія раёна» (далей – вучэбная праграма) прызначана для IX класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Вучэбная праграма разлічана на 35 гадзін (1 гадзіна ў тыдзень). Настаўнік можа самастойна пераразмеркаваць названыя гадзіны ў залежнасці ад узроўню падрыхтаванасці вучняў.

3. Мэта – развіццё ведаў вучняў аб правінцыяльных асаблівасцях прыроды і гаспадаркі роднага краю, практычнага прымянення геаграфічных ведаў, атрымання навыкаў геаграфічнага аналізу тэрыторыі на краязнаўчым прынцыпу.

4. Задачы:

прывіць вучням любоў да роднага краю;

навучыцца самастойна праводзіць элементарныя назіранні за прыродай;

канцэнтрыраваць увагу на экалагічных праблемах роднага краю;

навучыць вучняў самастойна карыстацца параўнальным метадам пры вывучэнні геаграфічных пытанняў;

вызначаць галоўнае ў вялікім аб'ёме геаграфічнай інфармацыі;

ад простага і блізкага да больш складанага і незнаёмага – асноўная задача фарміравання геаграфічных ведаў.

5. Формы і метады навучання і выхавання рэкамендаваны з улікам узроставых асаблівасцей вучняў IX класа, змястоўнага і працэсуальнага кампанентаў навучальнага матэрыялу. Могуць выкарыстоўвацца франтальная, парная, калектыўная і індывідуальная формы работы.

Метады арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці:

па крыніцы выкарыстання: славесныя, наглядныя, практычныя;

па характары навучання: рэпрадуктыўныя, пошукавыя, праблемныя;

па логіцы выкладання і ўспрымання: індуктыўныя і дэдуктыўныя.

Асноўныя формы правядзення заняткаў: практычныя работы, палявыя экскурсіі, экскурсіі на мясцовыя прадпрыемствы, творчыя работы. Праграма прадугледжвае складанне спіса геаграфічных аб'ектаў тэрыторыі раёна, збор легенд і звестак аб ахоўваемых раслінах і жывёлах.

Практычныя работы і экскурсіі будуць садзейнічаць набліжэнню вучняў да прыроды роднага краю, яго гаспадарчых асаблівасцей і паняцця сучасных экалагічных праблем. Вучні складаюць чырвоны сшытак рэдкіх раслін і прадстаўнікоў жывёльнага свету роднага краю, ёсць магчымасці назіраць за надвор'ем, весці феаналагічныя назіранні.

6. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу выяўляюцца ў тым, што ў вучняў будуць сфарміраваны:

6.1. уяўленні аб:

геаграфіі роднага краю, прыродных і гаспадарчых асаблівасцях, умовах засялення і асваення тэрыторыі свайго раёна, яго этнагістарычных асаблівасцях;

выдатных ураджэнцах раёна, іх укладзе ў развіццё навукі, культуры Беларусі;

асаблівасцях насельніцтва, рэлігійным складзе, асаблівасцях канфесій і іх уплыве на грамадскае жыццё мясцовага насельніцтва;

нацыянальным складзе, лінгвістычных асаблівасцях сучаснага рассялення насельніцтва ў межах раёна;

геакультурных асаблівасцях паселішчаў, гаспадаркі, гаспадарча-культурнай геаграфіі;

асновах гісторыка-культурнага і культурнага краявідазнаўства;

элементах культурнай спадчыны;

чынніках ладу жыцця;

перспектывах развіцця гаспадаркі раёна;

6.2. уменні:

даваць комплексную геаграфічную характарыстыку свайго раёна, адзначаць дэмаграфічную сітуацыю ў раёне;

выяўляць асаблівасці рассялення насельніцтва па тэрыторыі;

характарызаваць этнаграфічныя і лінгвістычныя асаблівасці насельніцтва;

называць асаблівасці развіцця гаспадаркі, прыроды, рассялення;

выяўляць асаблівасці выкарыстання мясцовых карысных выкапняў;

паказываць вынікі «культурнага» ўплыву на прыроду;

умець «расшыфровываць» геаграфічныя назвы;

збіраць назвы мясцовых урочышчаў і даваць тлумачэнне аб іх паходжанні, падзяляць на групы;

збіраць легенды аб розных цікавых мясцінах раёна;

выяўляць і паказываць па карце сучасныя прыродныя, гісторыка-культурныя і культурна-краявідныя раёны;

выяўляць сацыяльныя і эколага-эканамічныя асаблівасці, аб'екты культурнай спадчыны, складаць спісы ахоўваемых жывёл і раслін раёна.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

Уводзіны (1 гадзіна)

Што вывучае геаграфія краю, раёна? Мэта, задачы, актуальнасць, метады даследаванняў.

Тэма 1. Геаграфічнае становішча раёна (3 гадзіны)

Тэрыторыя раёна ў сістэме геаграфічных каардынат. Памеры. Сваеасаблівасці месцазнаходжання раёна, межы, суседзі. З гісторыі ўзнікнення раёна. Центр раёна. Прыродныя і гістарычныя прадпасылкі развіцця раёна і яго цэнтра.

Практычная работа:

1. Вызначэнне геаграфічнага становішча і каардынат крайніх кропак і цэнтра раёна, населенага пункта.

Тэма 2. Прыродныя ўмовы і рэсурсы (2 гадзіны)

Тэктанічная структура і геалагічная гісторыя і будова. Месца раёна на крышталічным фундаменце. Асадкавы чахол. Уплыў старажытнага зледзянення і формы рэльефу. Адклады ледавіка. Асадкавыя пароды. Геалагічныя помнікі. Нетры. Мясцовыя рэсурсы. Будаўнічыя матэрыялы. Структура зямельнага фонда і яго выкарыстанне. Яры на тэрыторыі раёна.

Экскурсія:

1. Вывучэнне прадпрыемства распрацоўкі радовішча мясцовых карысных выкапняў, берага ракі з апісаннем геалагічных агаленняў.

Тэма 3. Рэльеф (2 гадзіны)

Сучасны рэльеф тэрыторыі раёна, характэрныя формы і іх паходжанне. Нізіны і ўзвышшы, іх характарыстыка. Геаграфічныя краявіды. Уплыў рэльефа на ўмовы жыцця і характар гаспадарчай дзейнасці.

Тэма 4. Клімат (2 гадзіны)

Асаблівасці кліматычных умоў. Агракліматычны раён. Сонечная радыяцыя. Працягласць дня, сонечнага ззяння. Атмасферная цыркуляцыя. Мясцовая ружа вятроў у студзені і ліпені. Хуткасці мясцовых вятроў. Тэмпература паветра. Уплыў клімата на развіццё сельскай гаспадаркі. Вільготнасць паветра. Ападкі. Размеркаванне па порам года. Патрабавальнасць да цяпла селькагаспадарчых культур.

Практычныя работы:

2. Вызначэнне асаблівасцей кліматычных умоў раёна.

3. Састаўленне каляндара надвор’я.

Тэма 5. Гідраграфія раёна (2 гадзіны)

Агульная характарыстыка. Паверхневыя і падземныя водныя рэсурсы. Рачная сетка і яе элементы. Характарыстыка асноўных рэк, каналаў. Азёры і вадасховішчы. Прыродныя крыніцы. Характарыстыка найбольш буйных вадаёмаў і іх рэсурсаў. Напрамкі выкарыстання ў гаспадарчай дзейнасці насельніцтва. Ахова паверхневых вод.

Экскурсія:

2. Выяўленне экалагічнага стану водных аб’ектаў (ракі, возера, сажалкі, крыніцы).

Тэма 6. Глебы (3 гадзіны)

Глебаўтваральныя пароды і тыпы глебавых працэсаў. Асноўныя тыпы глебаў. Зямельныя рэсурсы раёна. Размеркаванне па тэрыторыі раёна. Структура ўгоддзяў. Меліярацыі глебаў. Эрозія глебаў і іх ахова.

Практычныя работы:

4. Вызначэнне тыпаў глеб і ацэнка іх для выкарыстання.

5. Закладка і замалёўка шурфа.

Тэма 7. Расліннасць (2 гадзіны)

Сучаснае расліннае покрыва. Лясы. Лясныя фітацэнозы. Лугі, балоты і іх тыпы. Выкарыстанне лясных рэсурсаў і іх ахова. Батанічныя заказнікі. Лекавыя расліны. Рэдкія віды раслін і іх ахова.

Экскурсія:

3. Вывучэнне раслінных груповак.

Практычная работа:

6. Састаўленне спіса (чырвонага сшытка) рэдкіх і знікаючых раслін.

Тэма 8. Жывёльны свет (3 гадзіны)

Сучасная фауна і біялагічная разнастайнасць. Прамысловыя віды жывёл. Птушкі. Рэдкія і ахоўваемыя віды жывёльнага свету.

Экскурсіі:

4. Вывучэнне жывёльнага свету роднага краю.

5. Састаўленне спіса рэдкіх і знікаючых прадстаўнікоў жывёльнага свету.

Тэма 9. Насельніцтва (3 гадзіны)

Гісторыі засялення. Помнікі славянскай культуры: гарадзішчы, паселішчы, курганы. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел раёна. Тыпы паселішчаў. Дынаміка насельніцтва. Колькасць і шчыльнасць насельніцтва. Нацыянальны склад. Гарадское і сельскае насельніцтва. Узроставая і палавая структура. Міграцыя насельніцтва раёна. Працоўныя рэсурсы. Матэрыяльная і духоўная культура, асаблівасці рэлігійнага складу.

Экскурсія:

6. Старажытныя і сучасныя паселішчы, культавыя будынкі і збудаванніі, культура насельніцтва.

Тэма 10. Прамысловасць (3 гадзіны)

Гісторыі развіцця. Структура прамысловасці раёна. Асноўныя прадпрыемствы. Сучасны стан прамысловасці. Рэнтабельнасць прадпрыемстваў.

Геаграфія народных промыслаў. Малы бізнес.

Экскурсія:

7. Экскурсія на вядучае прадпрыемства раёна, горада, апісанне і аналіз.

Тэма 11. Сельская гаспадарка (3 гадзіны)

Аграпрмысловы комплекс (АПК) раёна: структура і спецыялізацыя. Тыпы сельскіх гаспадарак і іх спецыялізацыя.

Раслінаводства. Вядучыя культуры, пасяўныя плошчы і іх ураджайнасць. Спецыялізацыі жывёлагадоўлі. Дынаміка пагалоўя і прадуктыўнасці.

Механізацыя і хімізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці. Экалагічныя праблемы. Перспектывы развіцця.

Экскурсія:

8. Экскурсія на ферму, прадпрыемствы АПК.

Тэма 12. Транспарт (1 гадзіна)

Галоўныя транспартныя шляхі. Перспектывы развіцця транспарту.

Тэма 13. Рэкрацыйныя рэсурсы (1 гадзіна)

Кліматычныя рэсурсы. Гісторыка-культурная спадчына, помнікі гісторыі і культуры. Установы рэкрэацыйнай дзейнасці. Перспектывы арганізацыі кароткачасовага адпачынку. Асноўныя экскурсійныя маршруты раёна.

Практычная работа:

7. Распрацаваць маршрут і правесці экскурсію па знакамітым мясцінам раёна.

Тэма 14 Экалогія раёна (3 гадзіны)

Уплыў гаспадарчай дзейнасці (прамысловасці, сельскай гаспадаркі) на прыроду раёна. Экалагічнае становішча раёна. Ахоўваемыя прыродныя тэрыторыі.

Практычныя работы:

8. Скласці спіс назваў паселішчаў, гідралагічных і іншых фізіка-геаграфічных аб'ектаў.

9. Аналіз палітыка-адміністратыўнага падзела раёна.

10. Скласці чырвоны сшытак раёна.

11. Збор легенд тэрыторыі раёна.

Рэзерв часу (1 гадзіна)